Заданні па функцыянальнай граматнасці па беларускай мове.
11 клас
Прачытайце ўрывак з нарыса У.Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”.
Выканайце заданні да тэксту.

1. Уставіць прапушчаныя літары ў словах.
2. Якую рысу характару, уласцівую беларусам, паказвае выпадак, апісаны ў тэксце?
3. Выпішыце з тэксту прыслоўі і блізкія да іх па значэнні спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі, раскрываючы дужкі.
4. Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм, растлумачце яго значэнне.

Падчас паўстання 1863 — 1864 г.г. за нев..лічкім атрадам, коннікаў на 40, зраненым, выматляным у баях, знемагаючым — гналася карная ўрадавая часць у 200 шабляў. Дзяліла іх гадзіна адлеглас..і. Камандзір зразумеў: не ўцячы. Буд..е няроўны бой, смерць ім, а п..раненым — шыбеніца. І тады ён ( с ) вядома скараціў гэтую гадзіну. Спыніў атрад у лесе (не) (па) далёк ад карчмы, прывязаў коней, загадаўшы аднаму паўстанцу рабіць так, каб тыя (з) рэдку гігаталі. Астатнія пайшлі ў карчму, узялі ў карчмара ўсе вёдры «паіць коней» і пачалі ц..гаць ваду са студні ў лес. За палову гадзіны перан..слі каля тр..хсот вёдраў і вылілі ваду пад дрэвы. Пасля пайшлі далей. Знясіле..ыя паўстанцы бурчалі на свайга камандзіра, але той ведаў людзей і ведаў, што рабіць…
Карная частка спынілася каля карчмы. Афіцэр спытаў, ці не было тут «мяцежнікаў».
— Былі, паночку, коней паілі.
Ужо гэта было н..звыкла: паіць коней, калі табе наступаюць на пяткі.
Значыць не баяц..а.
— Доўга паілі?
— Доўга. Трысты вёдраў аднеслі ў лес.
Арыфме..ыка была простая. Вядро на каня, бо рабілася усё ж (на) спех.
Значыць, трыста шабляў, стр..льбаў або нават і проста кос. Афіцэр адмовіўся ад пагоні.
Іх ад..зяляла тады ад па..станцаў дз..ве вярсты, бо коні тых тады ледзь ішлі…
Атрад уліўся ў большы і доўга яшчэ мужна ваяваў.

Адказ на пытанне 2: знаходлівасць,хітрасць.

Адказ на пытанне 4: дзве вярсты.

Заданні па функцыянальнай граматнасці па беларускай мове.

10  клас










Заданне . Разгледзьце малюнкі і складзіце 10 сказаў на тэму “ Мая Беларусь”. Можна карыстацца моўнымі шаблонамі.

1. У мяне ёсць цікавыя малюнкі…..
2. На іх намаляваны (а) .............
3. Калі гэта вуліца, апішыце надвор'е - малюнак здымаецца на малюнку (што, што, што) дзень, раніцай .... Падрабязнасці (яркае сонца свеціць, хмары ў небе і г.д.).
4. Апісаць знешні выгляд беларусаў, адзенне, чым занятыя; аб'екты: памер, колер, знакі і г.д.).
5. Іх твары (твар, твар) ... (радасны, сумны, сканцэнтраваны), таму што ...
6. Я думаю (мне здаецца), што .... (Зрабіце выснову.)

Заданні па функцыянальнай граматнасці па беларускай мове.
8 клас

Васілёк





1. Разгледзім воблака слоў і здагадайцеся, які верш М. Багдановіча схаваны ў ім.
2. Прачытайце тэкст

Даўным-даўно жыў тут чалавек. Зваўся ён Васілём. Вельмі любіў Васіль кветкі, а таму і сам вырошчваў іх. Новым кветкам даваў імёны.
Аднойчы ў яго садзе з’явілася новая кветачка. Была яна блакітнага колеру. Яна ўмела размаўляць і пры першым спатканні папрасіла Васіля, каб ён хутчэй даў ёй імя. Прыгожае, мілагучнае.
Доўга-доўга думаў Васіль і нарэшце разважыў, што назвы лепшай за Васілёк не прыдумаць.
Васіль з Васільком многа чаго не дагаварылі. Але аб новай кветачцы, якая да таго ж умее гаварыць, даведаўся туташні злосны пан. Ён і загадаў Васілю прынесці кветку да яго ў святліцу.
Пра гэтае няшчасце дачуўся і Васілёк. Ён таксама не хацеў жыць у злоснага чалавека і ператварыўся ў чырвоную нікім незаўважаную кветачку.
Азвярэлы пан люта пакараў Васіля, а напрыканцы мучэння загадаў укінуць яго цела ў рэчку. Так і загінуў Васіль, але кветачка — засталася. А людзі і перайменавалі сваё паселішча Васількамі — як памяць аб Васільку, Васілю і яго кветках.

3. Прапануйце свій загаловак тэксту.
4. Вызначце асноўную думку тэксту.
5. Выпішыце з тэксту два словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.
6. Выпішыце з тэксту якасны прыметнік, утварыце ад яго простую форму вышэйшай ступені параўнання, запішыце.
7. Выпішыце з тэксту просты ўскладнены сказ, укажыце, чым ён ускладнены.

Заданні па функцыянальнай граматнасці па беларускай мове.

9 клас

Спішыце тэкст, устаўляючы ў яго народныя вітанні і зычэнні.

ВІТАННІ І ЗЫЧЭННІ
Сярод беларускіх народных выслоўяў шмат вітанняў з добрымі зычэннямі людзям, якія працуюць у хаце, на полі, на агародзе, на двары, на таку. У час працы зычылі спору, плёну.
Сейбіту – … ; агародніцы – … ; жнейцы – … ; ткаллі – … ; рыбаку – … . Гаспадыні, што рашчыняе
хлеб, – … ; доіць карову – … ; збівае масла – … ; пячэ бліны – … . У гэтых ветлівых і сардэчных зваротах-зычэннях выяўлена вялікая павага да працы і да працоўнага чалавека.
Вядомы шматлікія добрыя пажаданні пры розных іншых акалічнасцях. Пры зборах у дарогу – … ; на наваселлі – … ; у лазні – … ;пры чханні – … ; пры наведванні хворага – …
(Паводле М. Я. Грынблата).
Для даведкі:

- «Поўны сеці!»
- «Шоўкавы венік, лёгкі дух!»
- «Багата на ўток!»
- «Радзі, божа, на камені і пад каменем!»
- «Малочна вам!»
- «З вядро качаны!»
- «Будзь здаровы на ўвесь год, як калядны лёд!»
- «Падходна вам!»
- «Скачком бліны!»
- «Каб з аднаго каласочка  паўрашаточка, а з аднаго снапочка была цэла бочка!»
- «Комам масла!»
- «Гладкае вам дарожкі!»
- «Бадай табе палепшала”
- «Гэтай будынкі на пастаянне, а вам
на пражыванне!»

Заданні па функцыянальнай граматнасці па беларускай мове.

6 класс

1. Прачытайце тэкст. Вызначыць тэму тэксту.
2. Вызначыць стыль тэксту і тып.
3. Выпішыце з тэксту мнагазначнае слова. Складзіце два словазлучэнні, у якіх гэта слова ўжывалася ў розных значэннях.
4. Знайдзіце ў тэксце слова, утворанае прыставачна-суфіксальным спосабам, разбярыце яго па саставе.

Беларусь багатая на паверхневыя воды, у краіне каля 20800 рэк. Большасць рэк невялікія, 42 ракі маюць даўжыню ад 100 да 500 км. Гушчыня рачной сеткі складае прыкладна 40 км/км$^2$, на паўночным усходзе Беларусі 60 км/км$^2$. Сярэдні агульны сцёк 57,9 км$^3$. 59 % сцёку складаецца ў межах Беларусі (унутраны сцёк). Найбольш распаўсюджаны на Беларусі раўнінныя малыя рэкі, якія працякаюць у адносна неглыбокіх, добра распрацаваных шырокіх далінах са спадзістымі схіламі. Яны маюць складзеныя з лёгкаразмыўных грунтоў звілістыя рэчышчы з чаргаваннем плёсаў і перакатаў, невялікія нахілы воднай паверхні, павольнае цячэнне. У межах узвышшаў даліны рэк больш выразныя, іх цячэнне больш хуткае; месцамі, асабліва ў вярхоўях, такія рэкі цякуць у ярах; іх берагі стромкія, узроўні вады пры раставанні снегу і значных дажджах могуць павышацца на 2—3 м, але затым хутка спадаць. На поўдні Беларусі шмат рэк, якія цякуць праз балоты або маюць значныя забалочаныя ўчасткі ў складзе сваіх вадазбораў. На поўначы Беларусі значную частку складаюць рэкі, якія выцякаюць з азёр або цякуць праз іх. За вытокі рэк звычайна прымаюць месцы, з якіх з’яўляецца пастаяннае рэчышча патоку; на Беларусі гэта найчасцей крыніцы, балоты, радзей азёры.